# «ПІСЬМЕННІК БЫЎ СВАІМ ЧАЛАВЕКАМ НА РАДЫЁ…»: АЛЕГ ВІНЯРСКІ

**А. А. Смірнова**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

Алег Вінярскі – вядучы, акцёр, рэжысёр, пастаноўшчык радыёспектакляў. Свае першыя радыёспектаклі пачаў ставіць пасля прыходу ў рэдакцыю «Беларуская маладзежная». У 1996 годзе прыйшоў працаваць рэжысёрам ў рэдакцыю літаратурна-драматычнага вяшчання Беларускага радыё. На канале «Культура», акрамя пастановак, чытаў творы беларускіх і замежных аўтараў. Запісаў больш за 35 аўдыякніг. Стваральнік уласных літаратурных і тэатральных праектаў. Лаўрэат і дыпламант міжнародных радыё- і кінафестываляў.

З Алегам Вінярскім мы сустракаліся ў далекім 2009, калі я рыхтавала навуковы артыкул пра пісьменніцкае слова на радыё і збірала экспертныя меркаванні. Прайшло больш за дзесяць гадоў, але гутарка выглядае актуальнай і сёння. Асноўнай тэмай размовы стала роля пісьменніка ў радыёэфіры.

*– Пісьменнік на радыё – свой чалавек?*

– Цікавае пытанне, яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў назад пісьменнік быў сваім чалавекам на радыё, на сёння ж сувязі згублены, і многіх пісьменнікаў, якія б маглі наладзіць гэтыя сувязі, няма сярод жывых. Больш таго, я вам скажу, што публіцыстыкі практычна няма ў эфіры, у тым аб’еме, у якім яна была яшчэ пяць-восем гадоў назад. І праблему трэба шукаць менавіта на памежжы стагоддзяў, калі адбыўся пэўны катаклізм, які закрануў перш за ўсё гуманітарную навуку: структура «мастацкага» адышла ў нябыт, пэўны пласт мастацкай культуры быў, на жаль, заглушаны тэхнічным пераабсталяваннем, новымі лічбавымі носьбітамі інфармацыі, і голас чалавека, а дакладней голас пісьменніка, быў сапраўдны заглушаны ўсім гэтым, заглушаны рэкламай, сродкамі масавай інфармацыі, якія прапанавалі імгненную інфармацыю пра тое, што адбываецца ва ўсім свеце. Публіцыстыка знікла з эфіраў, таму што публіцыстыка – гэта развагі ўслых чалавека, які жыве ў гэтым вострым свеце і рэагуе на тыя праблемы, якія ён бачыць, ён акцэнтуе ўвагу на гэтых

праблемах. А тэхнічная навала ў пэўным сэнсе прынізіла пісьменніка, многія калі і працягвалі пісаць, то ў стол.

А радыё? Раней гэта быў штодзённы рупар у кожным доме. Калі адбыліся ўсе гэтыя змены, то пісьменнікі натуральна аддаліліся ад радыё і сталі крыху самі па сабе, сталі назіральнікамі жыцця. Вага пісьменніка ў грамадстве залежыць і ад таго, наколькі ён запатрабаваны ў сродках масавай інфармацыі, наколькі ён задзейнічаны на радыё ці тэлебачанні.

Я думаю, што неабходна вяртаць пісьменніка на радыё. Таму что не хапае пазіцыі чалавека, які сваё жыццё прысвяціў слову, які ведае, як з ім абыходзіцца і які бачыць, якія працэсы адбываюцца са словам, і увогуле з духоўнай сферай.

Так, за апошнія дзесяцігоддзі змянілася пісьменнасць людзей у горшы бок. Раней былі пэўныя школы, напрыклад, дыктарскія, якія давалі неабходную «ін’екцыю для асветніцтва». І пісьменнікі, якія былі на радыё, адказвалі яшчэ і за гэту, асветніцкую частку, аднаўлялі павагу да роднай мовы. Гэта актуальнае пытанне і, думаю, што ў бліжэйшы час мы станем сведкамі вяртання пісьменніцкіх імен у радыё- і тэлеэфір.

Адзінае, магу сказаць, што зараз есць ускосныя прыклады вяртання пісьменнікаў у эфір. Так, на радыёканале «Культура» ў праграме «Літаратурная анталогія» чытаюцца творы маладых аўтараў, аўтарытэтных класікаў. Але што тычыцца непасрэдна слова, то яго не хапае.

Раней, калі існавала былая структура камітэту, падзел на рэдакцыі, то пісьменнікі добра ведалі, што ў літаратурна-драматычнай рэдакцыі ёсць «іх кола» і заўсёды можна падзяліцца сваімі набалелымі думкамі і развагамі. У музычныую рэдакцыю прыходзілі кампазітары, у дзіцячую – дзіцячыя пісьменнікі, а ў літдрам прыходзілі масцітыя пісьменнікі: і Іван Шамякін, і Іван Чыгрынаў, і Янка Сіпакоў, і Іван Пташнікаў і многа яшчэ людзей, якія праславілі беларускую літаратуру і дзяліліся сваім жыццёвым і літаратурным вопытам. Гэта быў цэлы пласт людзей, якія цягнуліся да радыё, і многія пісалі пра гэта ў сваіх творах. Напрыклад, Янка Брыль часта ўзгадваў радыё ў сваіх творах; я, калі сустракаю гэтыя радкі, дык заўсёды думаю: Божа, які ж выдатны чалавек, ён сапраўды любіў радыё. І ў яго дзённікавых запісах «Жменя сонечных промняў» пастаянныя

спасылкі, што ён слухае радыё. Шамякін вельмі любіў радыё. І гэта кола падпітвалася гэтымі зносінамі, радыёгутаркамі, яны прыходзілі, дзяліліся нават асабістымі момантамі. А потым ставілі спектаклі па іх творах. Гэта сапраўды было пэўнае кола, асяроддзе, братэрства людзей – літаратурна-драматычная рэдакцыя. На жаль, сёння такога няма, калі і прыходзяць пісьменнікі ў рэдакцыю, то толькі з просьбай прачытаць творы.

*– У якіх журналісцкіх фарматах ці жанрах, на Вашу думку, удзел пісьменнікаў найбольш арганічны?*

– Я думаю, што канешне, больш за ўсе неабходна падтрымка пісьменнікаў у прапагандзе роднага слова. Тым больш у нас ёсць праграмы, прысвечаныя мове. І дзякуй богу. Яны цыклавыя, ідуць некалькі сезонаў. Туды б пісьменнікаў падключыць. Напрыклад, у праграме абмяркоўваецца праблема з мовай, мы можам мільён чалавек з вуліцы запытаць – ну і што? Гэта абсалютна нецікава. Мала таго, што гэта не аўтарытэтна, гэта меркаванне вуліцы. Чаму мы павінны арыентавацца на вуліцу, а не на чалавека, які ўсё сваё жыццё прысвяціў слову?! Чалавек з вуліцы сказаў і да вечара ўжо забыўся пра тое, што сказаў. А ў пісьменніка гэта болем адгукаецца. Бо ён носіць у сабе гэта слова, ён яго вылушчвае, новыя словы знаходзіць, па вёсках ездзіць, фальклор збірае, аўтэнтычнасць шукае. Вось у такіх праграмах удзел пісьменнікаў абавязковы. Нягледзячы на тое, што радыё – гэта практычна адзіны сродак масавай інфармацыі, які «не кінуў» мову і ідзе пастаяннае павелічэнне беларускамоўнага эфіру, тым не менш гэта трэба падмацаваць пісьменніцкім аўтарытэтам.

Неабходна далучаць пісьменнікаў і да абмеркавання ўвогуле праблемы з запатрабаванасцю беларускай мастацкай літаратуры, паколькі аўдыторыя згублена і трэба па-новаму наладжваць дыялог з чытачом, а часам і знаёмства. Зноў ісці праз раскрутку, папулярызаваць мастацкае слова. Каб, напрыклад, пісьменнік мог рабіць сваю аўтарскую праграму, прысвечаную беларускай літаратуры, дзе ён мог бы нешта каменціраваць, узгадваць, хай і артыст штосьці пачытае. Але потым зноў голас пісьменніка. Такого раней было шмат. І я вось зараз успамінаю, наколькі ўсё ж раней было важна гэта слова ў эфіры. Былі, напрыклад, такія вечары ў астанскінскай студыі, прыязджаў, напрыклад, выдатны ваенны пісьменнік Віктар Астаф'еў і расказваў пра сваё жыццё.

Цікавым было б меркаванне пісьменніка і пра грамадска-палітычныя праблемы. Але зараз усе ж такі важна прыцягнуць увагу да мастацкага слова, да літаратуры, да мовы. Бо радыё ці не адзіны сродак масавай інфрмацыі, які не кінуў мову. Радыё захавала культуру размовы, і дзякуй богу, што ёсць канал «Культура», дзе гучыць беларуская мова. І на Першым канале радыё гучыць родная мова, але гэта трэба падмацаваць аўтарытэтам пісьменніка.

*– А якія пісьменніцкія тэмы, закранутыя ў літаратуры, найбольш запатрабаваны на радыё?*

– Зараз расце інтарэс да гістарычнага мінулага, да гісторыі Беларусі: адкуль мы, дзе нашы карані. Можа час гэта зараз запатрабаваў, то, да чаго заўсёды ляжала душа Уладзіміра Караткевіча, які стварыў цудоўны рамантычны ідэалістычны вобраз беларуса. Запатрабавана спроба знайсці карнявую сістэму. Мне здаецца гэта пасыл для ўсяго чалавецтва. Бо каб аформіцца як нацыя, знайсці моцную ідэалагічную аснову, трэба ведаць свае карані.